Баявое комсамольскае прывітаньне М. ГОРКАМУ

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90
6 месяцаў	1 р. 80
1 год	3 р. 60

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 108 (1377) ЧАЦЬВЕР, 14 мая 1931 г.

Нашь Максімыч, буравесьнік Чырвонага Кастрычніка, прыехаў у СССР



Учора увечары з замяжы прыехаў у СССР пралетарскі пісьменьнік Максім Горкі.

На станцыі Негарэлае М. Горкага сустракалі прадстаўнікі ад партыйных, комсамольскіх грамадзкіх організацый.

З Масквы ад РАПП: Серафімовіч, Гладкоў, Леонаў, Усевалод Іваноў і інш. рэдактар „Крестьянской газеты" Урыцкі і Халатаў. З Менску: ад БелАПП Галавач, Крапіва, Бэндэ і інш. прадстаўнікі ад ударнікаў менскіх прадпрыемстваў, ад цэнтральнага друку.

За час свайго кароткага прабываньня на ст. Негарэлае М. Горкі правёў з рабочымі, чырвонымі прымежнікамі гутаркі аб становішчы рабочых у капіталістычных краінах, аб растучым крызісе, аб разгорнутым пераможным социялістычным будаўніцтве у СССР, аб разгорнутай траўлі СССР з боку капіталістых, аб шалёнай падрыхтоўцы буржуазіі да новых імпэрыялістычных боек і у прыватнасьці аб падрыхтоўцы да нападу на Савецкі Саюз.

Прадстаўнікі ад рабочых-ударнікаў расказалі М. Горкаму як змагаюцца рабочыя за выкананьне і перавыкананьне промфінпляну, як працуюць па ўдарнаму па завяршэньню пабудовы фундаманту социялістычнай экономікі,

Чырвоныя прымежнікі расказалі Максымычу аб сваёй вайсковай падрыхтоўцы, аб барацьбе за аўладаньне вайсковай тэхнікай, аб дапамозе з боку чырвонаармейцаў у рабоце па социялістычнай рэконструкцыі сельскае гаспадаркі.

Таварыш М. Горкі мяркуе жыць у СССР покуль будуць дазваляць яму кліматычныя умовы. З Негарэлае М. Горкі накіраваўся у Маскву.

У Менску на вокзале быў організаван мітынг сустрэчы прысьвечаны прыезду М. Горкага у СССР.

(Падрабязны матар'ял аб сустрэчы М. Горкага будзе зьмешчаны у чарговым нумары)

ФІЗКУЛЬТУРА НА СЛУЖБЕ АБАРОНЫ

9-ты зьезд УсеЛКСМ у сваіх пастановах выразна вызначыў задачы фізкультурнага руху ў справе павышэньня продукцыйнасьці працы рабочае моладзі і ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны.

Выкананьне гэтых задач патрабуе ад усіх фізкультурных організацый карэннай перабудовы усёй сваей работы.

Не трэба адзначыць, што шмат фізкультурных гурткоў і саветаў не перабудавалі сваёй работы так каб забясьпечыць поўнае выкананьне пастаўленых перад імі задач: Фізкультурныя гурткі вельмі часта працуюць па-старынцы, не перабудавалі сваю праграму з мэтай пашырэньня ваенізаваных практыкаваньняў.

Комсамольскія організацыі часам не прыдаюць належнага значэньня фізкультурнаму руху і ня кіруюць ім. Ёсьць шмат фактаў развалу фізкультурных гуртоў, імкненьне да рэкордсменцтва, адсутнасьць клясава-выхаваўчай працы. Міма ўсяго гэтага бяз усякага рэагаваньня праходзяць комсамольскія ячэйкі і камітэты.

Таксама многія комсамольскія камітэты і ячэйкі не зварочваюць увагі на ваенізацыю фізкультурных работ.

Ва ўсіх відах фізкультуры і спорту павінны быць уведзены і пашыраны найбольш каштоўны ў вайскова-прыкладных адносінах практыкаваньні, (аўто-мото-вэлё-спортовы спорт, фэхтаваньне і г. д.)

З пераходам да летняй работы фізкультурныя гурткі маюць значна большую магчымасьць ваенізаваць свае рады.

Задачы ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны фізкультурныя організацыі здолеюць выканаць пры цеснай сувязі з асоавіяхімаўскімі організацыямі, пры сталай дапамозе і кіраўніцтве комсамолу і профсаюзаў.

Комсамольская організацыя павінна ўцягнуць усю рабочую і працоўную моладзь у фізкультурны рух і дапамагчы яго поўнай перабудовы ў сувязі з пастаўленымі перад ім задачамі.

Комсамольскія ячэйкі і камітэты павінны праверыць работу усіх фізкультурных гурткоў і саветаў, перагледзець програмы іх работы, чуйна рэагаваць на сказаньні ў іх рабоце. У сувязі з неадзавальняючым разгортваньнем масавай работы вакол значка „Гатоў да працы і абароны", комсамольскім ячэйкам і камітэтам неабходна прыняць усе захады каб наладзіць яе.

Надыходзячая летняя адпускная кампанія павінна быць выкарыстана для шырокай работы сярод рабочай моладзі і фізкультурнікаў па організацыі чарговага водпуску ў асоавіяхімаўскіх лягерах, што дасьць магчымасьць яшчэ больш замацаваць атрыманыя ў гуртках вайсковыя веды.

Толькі пры супольнай рабоце фізкультурных і комсамольскіх організацый фізкультурная організацыя Беларусі стане сапраўды масавай і здолее выканаць тыя адказныя задачы, якія перад ёю пастаўла партыя.

ПРАЦОЎНЫЯ ЗАВАЁЎВАЮЦЬ ВУЛІЦЫ ГІШПАНІІ

У Мадрыдзе адбылася шматлюдная дэмонстрацыя комуністых

ПАРЫЖ. 11.—У Мадрыдзе 10 мая ўвечары адбылася шматлюдная дэмонстрацыя комуністых. Дэмонстранты праходзілі праз цэнтральныя раёны гораду з чырвонымі сьцягамі і крыкамі: „Далоў духавенства", патрабуючы разброеньня грамадзянскае гварды.

Шматлікія групы дэмонстрантаў разьмясьціліся супроць будынку рэдакцыі монархічнай газэты „АБЦ". Тут раздаваліся крыкі: „Сьмерць монархістым!"

Пры спробе дэмонстрантаў падпаліць казармы грамадзянскае гварды паміж імі і поліцыяй завязалася перастрэлка, у выніку якое шмат параненых. Генэральны прокурор зьвярнуўся да дэмонстрантаў з папярэджаньнем разыйсьціся, пагражаючы ў іншым выпадку прымусовым разгонам і арыштамі.

Міністар унутраных спраў прымушаны быў абяцаць закрыць газэту „АБЦ".

Група комсамольцаў імкнулася захапіць склад зброі грамадзянскае гварды, але была расьсеяна поліцыяй і войскамі. Быў таксама зроблены замах на захоп другога складу зброі

Паміж комсамольцамі і грамадзянскай гвардыяй адбывалася перастрэлка.

Забастоўка ў Мадрыдзе прыняла ўсеагульны характар

ПАРЫЖ. 11.—А 3 г. уночы (з 10-га на 11-е мая) агромны натоўп працягваў дэмонстраваць на пляцы Пуэльса дэль-Соль. Быў складзены агромныя кіпы нумароў монархічных газэт „АБЦ" і Эль-дэбатэ.

Ня гледзячы на самыя сур'ёзныя уговоры рэформісцкіх профсаюзаў і соцыялістых прапанаваўшых працягваць нормальную работу, бастуюць усе шофэры таксі, большасьць трамвайных служачых і рабочых будаўніцтва. У горадзе можна бачыць усяго некалькі трамваяў. Дэмонстрацыі працягваюцца. Шматлікія групы дэмонстрантаў імкнуліся падпаліць царкву езуітаў. Магазыны зачынены.

Далейшыя паведамленьні з Мадрыду агенства Гавас паказваюць што забастоўка прыняла ўсеагульны характар. А 12-й гадзіне 30 хв. дэмострантам ўдалося падпаліць рэзыдэнцыю езуітаў.

Перамога рэволюцыйных рабочых

ПАРЫЖ, 9. Па паведамленьню агенцтва Гавас з Мадрыда, маракі крэйсэра „Хэймэ-I", які знаходзіцца ў порце Эль-Фэроль, атрымаўшы водпуск, адмовіліся пакінуць судно, пакуль ня будуць вызвалены 14 маракоў, арыштаваных за ўдзел у паўстаньні. Капітан крэйсэра быў прымушан вызваліць ўсіх арыштаваных.

Экономічныя ўмовы рабочых пагаршаюцца

БЭРЛІН. 9—Трацейская камісія ў Гамбурзе вынесла пастанову аб зьніжэньні зарплаты рабочых рыбалоўных суднаў на 4,5 прац.

У сярэдняй нямецкай бура-вугальнай прамысловасьці паміж прадпрыемцамі і рэформісцкімі профсаюзамі складзена згода аб скарочаньні рабочага дня для падземных рабочых на поўгадзіны з адпаведным зьніжэньнем зарплаты.

Гэтай згодай зьніжаецца зарплата 50 тысяч рабочых.

Масавае звальненьне рабочых

ВЕНА, 9. Як паведамляюць з Будапэшту, там учора забаставала 3000 рабочых вагонабудаўнічага заводу „Ганц" у знак протэсту супроць капіталістычнай рацыяналізацыі, у выніку якое капіталістымі праведзена масавае звальненьне рабочых.

Соцыял-дэмократычная моладзь пераходзіць у комсамол

БЭРЛІН. 8—Кіраўнік організацыі соцыял-дэмократычнай моладзі у Люнэбурзе (паўночная Нямеччына)—Шрэдэр заявіў, што ён пераходзіць у комсамол.

У Гіндэнбургу (Верхняя Сілезія) перайшлі у комсамол 4 члены соцыял-дэмократычнага саюзу моладзі.

У Пурме (Баварыя) на сходзе соцыял-дэмократычнай партыі 4 члены якое падалі заяву аб пераходзе у кампартыю, выступіў кіраўнік мясцовай організацыі „Маладых соцыялістых".

Зьлёт рэволюцыйнай моладзі Швэйцарыі

БЭРЛІН. 10—КСМ Швэйцарыі зьвярнуўся да працоўнае моладзі з заклікам сабрацца 24-25 мая ў Цюрыху, для удзелу у зьлёце рэволюцыйнай моладзі Швэйцарыі.

Быць гатовымі да абароны

Адна з асноўных задач савецкай фізычнай культуры, шляхам рацыянальна ўжываных фізычных практываньняў, гімнастыкі, спорту, гульняў. Разам з выкарыстаньнем натуральных фактараў прыроды,—рыхтаваць здаровую бая дольную зьмену як на фронце соцыялістычнага будаўніцтва, так і для надыходзячых боек з сусьветным капіталам. Выходзячы з задачы масавай падрыхтоўкі працоўных да абароны краіны в мэтай вучоту фізычнай падрыхтаванасьці працоўнае моладзі і стымуляваньня масавай самадзейнай работы працоўных, устанаўляецца узнагарода спэцыяльным значком (жэтонам) „Гатоў да працы і абароны" Права атрымаць жэтон мае кожны працоўны Саюзу, пасьля таго як здасьць устаноўленыя іспыты, якія ўключаюць: кіданьне гранаты. бег на 100 мэтраў, 1000, 500, скачкі. вэлёсыпэд—10 кілёмэтраў па шасэ і г. д. тры разьдзелы па тэорэтычных пытаньнях: асновы фізкультурнага руху і дзейнасьць Чырвонага Спортінтэрну і г. д.


Горад Менск, у асобе сваіх фізкультурнікаў, мае каля 200 кандыдатаў на атрыманьне значка, г. зн.—асоб якія прайшлі іспыты, здалі нормы па лыжах на дыстанцыю 10 кілёмэтраў за гадзіну і 15 хв. У лік кандыдатаў ўваходзяць члены профсаюзных і вузаўскіх колектываў ФК і частка гарнізону Бязумоўна што гэтая лічба кандыдатаў 200 зусім нездавальняючая. Задача кожнага колектыву ФК—разьвіць вялікую грамадзкую работу на вытворчасьці, ва ўстановах, сярод дарослых рабочых, работніц, якія яшчэ ня ўцягнуты ў плянамэрную падрыхтоўку да здачы іспытаў.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на жанчын, якія займаюць вельмі мізэрны процант сярод кандыдатаў на атрыманьне значка.

На летні сэзон, поўны багатых магчымасьцяй для разгортваньня масавай работы і сконцэнтраваньня яе у мясцох найбольшага зграмаджэньня працоўных, бюро ФК ЦСПСБ і ВСФКБ намячаюць рад мерапрыемстваў на папулярызацыі ідэі значка „Гатоў да працы і абароны" і прыцягненьня працоўных да здачы іспытаў. Кожнае з меркаваных выпярэцніцтваў (спартакіяда профсаюзаў БССР у ліпені месяцы, сялянская спартакіяда, фабрычна-заводзкія і раённыя сьвяты), уключае паасобныя віды іспытаў

Адчыненьне ўсебеларускага стадыёну—22-23 мая—суправаджваецца масавай здачай іспытаў усіх прысутных на тэрыторыі стадыёну з прэміяваньнем. Устанаўляецца консультацыя з спэцыялістых вышэйшай кваліфікацыі. (інструктар, урач). У гэты-ж дзень намячаецца старт і фініш масавага кроссу на дыстанцыю 3000 мэтраў для мужчыны і 1500 мэтраў для жанчыны з залікам нормы на значок. Там-жа на стадыёне, будуць організаваны сэмінарыі і курсы па падрыхтоўцы да здачы іспытаў. Сетка сэмінарыяў—курсаў па ўсёй тэрыторыі БССР мае свае програмы да пытаньняў здачы іспытаў. Задачы фізкультурнікаў БССР—закончыць здачу норм у працягу летняга сэзону. Максымальна прыцягнуць да іспытаў дарослых працоўных, практычна ажыцьцявіўшы рашэньні УсеЦСПС, партыі і ўраду аб фізкультурным руху Саюзу ССР.

Порфарыдаў.



Фізкультурнікі ф-кі „Комрацa" (Гомель) у паход за колектывізацыю.

Сёньня, а 4 гадз. дня, у памяшканьні Дому Пісьменьніка культурна-бытавы сэктар „Чырв. Зьмены" праводзіць нараду комсамольцаў і усіх маладых пісьменьнікаў і поэтаў, якія ўдзельнічаюць у рабоце пашыранага пленуму праўленьня БелАПП.

На павестцы дня: паказ барацьбы комсамолу ў пролетарскай літаратуры.

Рэдакцыя „ЧЗ"

БАЛЬШАВІЦКІМ МАРШАМ У БОЙ ЗА ПЯРШЫНСТВ

Комсамольскія камітэты і ячэйкі, раёны, МТС, саўгасы і колгасы, уключайцеся ў конкурс на лепшае правядзеньне другой бальшавіцкай,

У БОЙ ЗА ПЕРАХОДНЫ ГАНАРОВЫ СЬЦЯГ

20 мая сяўба павінна быць скончана

МАЗЫР. 6.—Колгасы Даманавіцкага сельсавету добра падрыхтаваўшыся да другой бальшавіцкай, з чырвонымі сьцягамі, са сьпевамі, з энэргіяй і вытворчым уздымам вышлі ў поле і прыступілі да сяўбы ўдарнымі брыгадамі. У першых радох ударнікаў сталі комсамольцы. Сяўба павінна быць скончана да 20 мая.

Усе колгасы сельсавету пераведзены на зьдзельшчыну, ацэньваючы ў працаднёх.

У дзень Першага Мая ў колгас „Новыя Даманавічы“ уступіла 30 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у „Новыя Тарканы“—14 гаспадарак. Вёска Халоднікі цалкам уліліся ў колгас „Новыя Халоднікі“. Сельсавет колектывізаваны на 50 проц.

Брыгада „Чырв. Зьмены“ А. Кузьмёнак, М. Міцкевіч

Далі сустрэчны другой бальшавіцкай

Вушачы. У сувязі з сьвяткаваньнем 1-га мая і другой гадавіны соцспаборніцтва, у Кубліцкім с-с. была разгорнута вялікая палітычная масавая работа навакол рашэньняў VI-га зьезду саветаў.

У выніку гэтага сельсавет зараз колектывізаваны на 36 проц.

Уперадзе ўсіх ідзе колгас „Барацьбіт“, які мае 57 гаспадарак. Колгас павялічыў абагулены гурт кароў з 33 да 68 галоў, прыняў сустрэчны плян засеву лёну ў 20 га.

Апанасьеў П. Д.

Поўнасьцю ўступілі ў колгас

Комсамольцы Аляксандраўскай ячэйкі ЛКСМБ (Капыльскага раёну) ба-баявому змагаюцца за колектывізацыю. Ячэйка гэтымі днямі арганізавала колгас „Заветы Ільліча“ куды поўнасьцю ўступілі ўсе комсамольцы і 15 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Ячэйка распаўсюдзіла на 1.000 рубл. трактарных акцый.

Брыгада „Ч. З.“ Шакалінская і Апанасенка.

Пастанова ЦК КП(б)Б аб масавым аглядзе ходу сяўбы і разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва, зьмешчаная ўмовы конкурсу паміж раёнамі, МТС, саўгасамі і колгасамі на лепшае правядзеньне сяўбы—павінны ўзьняць магутную хвалю вытворчага ўздыму шырокіх колаў рабочых саўгасаў, колгасьнікаў і аднаасобнікаў, спрыяць шырокаму разгортваньню соцспаборніцтва і ўдарніцтва, як асноўнаму мэтаду працы на соцыялістычных палёх.

Популярызаваўшы пастанову ЦК і ўмовы конкурсу сярод шырокіх працоўных мас, давёўшы іх да кожнай брыгады, кожнага рабочага саўгасу і колгасьніка, комсамольскія ячэйкі павінны сконцэнтраваць усю сваю ўвагу ў практычнай дзейнасьці—на 100 процантны ахоп соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам рабочых саўгасаў і колгасьнікаў, на барацьбу за максімальна скарочаныя тэрміны сяўбы.

Падвоіць рады арміі колгасьнікаў; у максімальна кароткі і раньні тэрмін скончыць сяўбу; ніводнага незасеянага гектара зямлі; поўнае выкананьне пляну контрактацыі; пераход ўсіх колгасаў на зьдзельшчыну і ліквідацыя абязьлічкі; 100 проц. выкананьне вытворчых пляну МТС, за 3-х зьменную 23-гадзінную работу трактара ў суткі, за рэжым экономіі гаручага—вось лёзунгі баявых дзеяньняў комсамольскай арганізацыі ў барацьбе за пяршынства і асноўныя паказчыкі для атрыманьня ганаровых пераходных сьцягоў.

Юнкораўскія брыгады, пасты і юнкоры-ўдарнікі, уключайцеся ў рашучы бой за пяршынства! Рапартуйце праз газэту аб сваіх перамогах, аб практыцы і вопыце работы, бязьлітасна бічуйце перашкоды, наносячы руйнуючы ўдар па кулаку і яго агентах—опортуністых.

Умовы конкурсу

Конкурс на лепшае правядзеньне агляду ходу сяўбы і організацыі спаборніцтва ў мэтах своечасовага і поўнага выкананьня плянаў засеву яравога кліну праводзіцца паміж раёнамі, МТС, саўгасамі, колгасамі і раённымі газэтамі. Асноўнымі паказчыкамі конкурсу зьяўляюцца:

1. Выкананьне поўнасьцю і ў вызначаны тэрмін плянаў сяўбы.

2. Найбольш поўнае выкананьне агромерапрыемстваў, накіраваных на павышэньне ўраджайнасьці (ачыстка насеньня, пасеў гатунковым насеньнем, радавы пасеў, выкананьне пляну тарпаваньня і ваппаваньня, зьнішчэньне сарнякоў і інш.).

3. Стварэньне кармовай базы (выкананьне пляну сяўбы траў, караньплодаў і сілосных культур, палепшаньне сенажаці і падрыхтоўка да сілосаваньня).

4. Правільная організацыя працы і пераход на зьдзельшчыну, а ў саўгасах і МТС—на зьдзельшчыну і гаспадарчы разрахунак.

5. Разгортваньне спаборніцтва і ўдарніцтва (складаньне соцдагавароў паміж паасобнымі брыгадамі, колгасамі, МТС, саўгасамі і раёну з раёнам і організацыя грамадзкага кантролю за выкананьнем дагавораў, максімальны ахоп ударніцтвам, організацыя грамадзкага буксіру над адстаючымі колгасамі, саўгасамі МТС і раёнамі ў цэлым і г. д.)

6 Выкананьне плянаў кантрактацыі.

7. Выкананьне заданьняў па соцыялізацыі раёнаў і паасобных саўгасаў і колгасаў.

8. На аснове ўдарнага правядзеньня сяўбы, правільнай організацыі працы і пастаноўкі масавай работы сярод аднаасобнікаў дабіцца максімальнага прыліву ў колгасы, кіруючыся ўстаноўкай, што ў часе веснавой сяўбы павінна быць аб'яднана ў колгасы ў раёнах дзейнасьці МТС ня менш 50 проц. і ў астатніх раёнах—30 проц. наяўнасьці ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Акрамя гэтых агульных патрабаваньняў, неабходна дабіцца:

Па МТС

а) ліквідацыі абязьлічкі; б) максімальнай нагрузкі на трактар пры 21-гадзінным рабочым дні ў суткі, захоўваючы шляхам патрэбнага догляду трактара яго спраўнасьць; в) максімальнай экономіі гаручага; г) дакладнага выкананьня дагавароў, складзеных з колгасамі.

Па колгасах і саўгасах

а) найбольшай выпрацоўкі ў часе ворыва і севу на адзінку цягавай сілы пры захаваньні поўнай працаздольнасьці яе; б) рацыянальнага скарыстаньня с.-г. інвэнтара, транспорту і збруі; в) організацыі ўзаемнай дапамогі паміж колгасамі, саўгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі; г) больш поўнага культурна-бытавога абслугоўваньня ў часе сяўбы рабочых саўгасаў, колгасьнікаў і акружаючых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак (яслі, пляцоўкі, сады, грамадзкае харчаваньне ў колгасах і саўгасах).

Па колгасах

лепшага організацыйна-гаспадарчага замацаваньня колгасаў, поўнага абагуленьня сродкаў вытворчасьці (згодна статуту) і стварэньня непадзельных капіталаў.

Раённаму друку

а) найлепшага асьвятленьня ходу сяўбы з завастрэньнем увагі на галоўных вучастках работы свайго раёну; б) організацыя масавай работы, якая спрые разгортваньню соцспаборніцтва і пасьпяховаму правядзеньню сяўбы.

Профсаюзным організацыям раёнаў

а) організацыі дапамогі колгасам у разгортваньні соцспаботніцтва; б) лепшай пастаноўкі масавай работы з членамі профсаюзаў пад лёзунгам: член профсаюзу—застрэльшчык колектывізацыі; в) організацыі непасрэднай дапамогі ў правядзеньні сяўбы, выкарыстоўваючы выхадныя дні, асабліва організацыі грамадзкага кантролю і дапамогі прыгарадным гаспадаркам.

Для кіраўніцтва аглядам у раёнах ствараюцца штабы з прадстаўнікоў РК КП(б)Б, РВК, райколгассаюзу, райпрофбюро, РК ЛКСМ, раённай газэты і рай КК РСІ.

Пры цэнтральным штабе, акрамя ўстанаўленьня пераходных сьцягоў згодна пастановы сэкратарыяту, ствараецца прэміяльны фонд, забясьпечваючы прэміяваньне лепшых колгасаў, саўгасаў і раёнаў, пасьпяхова скончыўшых сяўбу, і раённых газэт, лепш організаваўшых спаборніцтва.

Штаб агляду.

Змагацца за пяршынств

ПЛЕШЧАНІЦЫ. 8.

Колгасы Каменскага сельсаве[ту] вышлі на масавы сеў. Колгас „Чы[р]воны Кастрычнік“ падрыхтаваў [да] сяўбы больш 100 га пахаці, пасе[яў] 70 пудоў лубіну, пасадзіў 900 [пу]доў бульбы. Колгас «АДПУ“ падр[ых]таваў да пасеву 75 га, распач[аў] сяўбу раньніх культур.

Па раду колгасаў выяўлен[ы] недахоп цягавай сілы. У сувяз[і з] гэтым мацнейшыя па цягавай с[іле] колгасы наладжваюць ім дапамо[гу].

Колгасьнікі змагаюцца каб ні[во]дзін колгасны гектар яравога клі[ну] не застаўся не ўзараным і не [за]сеяным.

Аднаасобнікі бедвякі і серадня[кі,] бачачы дасягненьні і ўдарную пра[цу] на колгасных палёх, уліваюцца [ў] колгасы і сумесна заворваюць с[ве]межы.

У колгасе „Чырвоны Кастры[ч]нік“ за час сяўбы ўлілося 8 б[ядня]цка-серадняцкіх гаспадарак. У ко[л]гас „АДПУ“ 5 гаспадарак.

Каменскі сельсавет колектыві[за]ваны ўжо на 52 проц.

Брыгадзір ЦК ЛКСМБ А. Заслаўскі

За максімальна рань[ні] тэрмін

Слуцак. Колгасы Серадняко[ў]скі[га] с-с уключыліся ў сяўбу. На [...] лёх гаспадаром зямлі стаў трактa[р]. Сельсавет колектывізаван на [...] проц.

Каб поўнасьцю і датэрмінова [вы]канаць пасеўплян, колгас „Будз[ён]ны“ выклікаў на спаборніцтва ко[л]гас „Прогрэс“. Складзена соцумо[ва]. Колгас „Прамень комуны“ ўзар[аў] 23 га, колгас „Ботвін„—50 га.

Перадавыя колгасы „(Прогрэс[“,] „Прамень комуны“, „Ботвін“) уз[ял]і на грамадзкі буксір адстаючы[я] ў вясновай сяўбе колгасы: „Сталіна[“,] „Курган Рэволюцыі“ і „Но[вы] сьвет“.

У выніку пераводу ўсёй пра[цы] ў колгасах на зьдзельшчыну, ап[лаціўшы] ... вецую ў працаднёх, поўнай ліквідацыі абязьлічкі узьняты тэмп[ы] сяўбы. Колгасы скончаць працу р[аней] тэрміну, вызначанага пляна[м].

Брыгада „Чырвонай Зьмены“: Прыбытак і Рудзьк[і]

Дагнаць перадавых і дабіцца агульнага ўздыму

11 мільёнаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі сёньня стал на шлях колгасаў. Мільёны беднякоў і сераднякоў стануць заўтра на гэты шлях.

Наша неадымная задача, разам з барацьбой за тэмпы колектывізацыі, за новыя колгасы і новых колгасьнікаў,—мацаваць гаспадарчую моц колгасаў, змагацца за організацыю комуністычных форм і мэтодаў працы, за комуністычныя адносіны да яе.

„Самае выдатнае ў спаборніцтве месьціцца ў тым, што яно вытварае карэнны пераварот у поглядах людзей на працу, бо яно перайначвае працу з ганебнага, цяжкога ярма, якім яна лічылася раней, у справе гонару, у у справу славы, справу адвагі і геройства“. (Сталін).

Як-жа конкрэтна наладзіць соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў колгасах?

Вытворчая нарада—організатар ініцыятывы і актыўнасьці колгаснае масы

Вялікую ролю ў колгасе павінны адыграць вытворчыя нарады, як найважнейшыя форма організацыі ініцыятывы і самадзейнасьці колгаснае масы і карiўнік разгортваньнем соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Вытворчыя нарады займаюцца пытаньнямі: правільнай організацыі працы ў колгасах, складаньнем норм выпрацоўкі і пераводу на зьдзельшчыну, ліквідацыя абязьлічкі, расстаноўкай рабочае сілы, падрыхтоўкай вытворчых плянаў паасобных галін і ўсяго колгасу, барацьбой за ўздым ураджайнасьці і прыбыткоўнасьці гаспадаркі, будаўніцтва і замацаваньне колгасу.

Вытворчыя нарады, асабліва ў буйных колгасах, організоўваюцца як у колгасным маштабе, так і на паасобных вучастках, брыгадах.

Давесьці да ведама кожнага колгасьніка, комсамольца свайго колгасу яго конкрэтныя вытворчыя задачы ў час вясеньняй сяўбы, уборкі, засеву азімых і інш. Для гэтага трэба гаспадарча-фінансавы вытворчы колектыўны плян колгасу, нормы выпрацоўкі давесьці да кожнае брыгады, групы і колгасьніка.

Падрыхтоўкай пляну, яго конкрэтызацыяй і наглядам за яго выкананьнем павінна заняцца плянава-опэрацыйная група з лепшых ударнікаў.

Работа плянава-опэрацыйнай групы цесна ўвязваецца з рацыяналізатарскай работай і аўладаньнем агротэхнікай.

Пранізаць соцспаборніцтвам усе процэсы працы

Соцыялістычнае спаборніцтва не павінна дыктавацца зьверху, трэба організоўваць яго зьнізу, унутры колгасу, пачынаючы з паасобных груп працоўных і ўдарных брыгад і паасобных колгасьнікаў. Прыкладна ў наступным парадку: Працоўная брыгада, абгаварыўшы на сваёй вытворчай нарадзе давецзены да яе вытворчы плян, высунуўшы свае сустрэчныя дадаткі, выклікае на соцспаборніцтва другую працоўную брыгаду.

Колектыўна, на аснове вытворчага пляну, норм выпрацоўкі, складаецца соцдагавор. Дагавор не агульных разважаньняў, а конкрэтных абавязкаў, якія бярэцца выканаць брыгада і паасобныя брыгадзіры на працягу пэўнага тэрміну.

Соцдагаворы трэба складаць па наступных асноўных момантах: перавыкананьне норм выпрацоўкі, лепшая якасьць работы, 100 проц. выхад без прагулаў і спазьненьняў на работу, беражлівыя адносіны да машын і інвэнтара, набыцьцё мінімуму агротэхнічных ведаў і рад іншых абавязкаў.

Другая працоўная брыгада, атрымаўшы гэты выклік і дагавор, абгаварвае высунутыя пункты і можа прыняць цалком, або дадаць нешта новае, ці павялічвае нормы ўзятых абавязкаў.

Ударная брыгада—касьцяк ударных бальшавіцкіх тэмпаў

Уся праца брыгады павінна концэнтравацца навакол выкананьня ўзятых соцдагаворам абавязкаў. Для гэтага ствараюцца ўдарныя брыгады, групы энтузіястых, штурмавыя брыгады і іншыя формы ўдарніцтва, правёўшы вялікую масавую работу навакол гэтага пытаньня. Такім чынам, у працоўнай брыгадзе ствараюцца ўдарныя брыгады, куды могуць увайсьці ўсе, або частка колгасьнікаў брыгады.

Лепшыя ўдарныя брыгады, лепшых ударнікаў прэміяваць з колгасных прэміяльных фондаў.

Сіла прыкладу—буксір адстаючым

Соцспаборніцтва—гэта не рэкондсмэнцтва паасобных груп і людзей. Задача ў тым, як тав. Сталін сказаў: „даганяць лепшых і дабіцца агульнага ўздыму“. Ударная брыгада, ударнік павінен быць будаўніком усёй колгаснай гаспадаркі. Трэба наладзіць таварыскую дапамогу перадавых адстаючым. Дапамагчы ім падцягнуцца. Гэту задачу вырашыць грамадзкі буксір.

Акрамя дапамогі і паказу фізычнай ударнай працы, задача буксірнай брыгады—навучыць, расставіць сілы, паставіць на ўдарныя рэйкі працу адстаючых. Штурмавая, буксірная работа павінна ўскалыхнуць грамадзкую думку на ліквідацыю прарыву.

Навокал соцспаборніцтва і ўдарніцтва трэба мобілізаваць грамадзкую думку. Безадкладна, як толькі гэтая работа пачалася, організаваць вытворчую дошку соцспаборніцтва, на якой на першым месцы павінны быць куткі чырвоны і чорны, ці „абозу“ і „авангарду“ трэцяга, рашаючага...

Гэтая дошка павінна стаць люстрам вытворчых процэсаў, новых форм соцыялістычнай працы. На дошцы вывешваць выклікі, соцдагавары, чорныя і чырвоныя сьпісы, кароткія опэрацыйныя зводкі ходу і праверкі вынікаў соцспаборніцтва.

Па магчымасьці, трэба організоўваць вытворчыя конкурсы на лепшага ўдарніка, трактарыстага, касца, жняю і г. д. Перад сяўбою, ўборкай організоўваць вытворчыя колгасныя манэўры, як практыкуецца на вытворчасьці.

Разам з гэтым, неабходна наладзіць падлік вынікаў соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Брыгадзір павінен весьці вучот (праз дзеньнік) вынікаў як і колькасьці, так і па якасьці работ[ы] усяе брыгады і кожнага ўдарніка. Н[а] вытворчай нарадзе брыгады падаг[у]ліць вынікі соцспаборніцтва. Дл[я] праверкі выкананьня пунктаў дагаво[]раў павінна быць наладжана памі[ж] брыгад самаправерка, шляхам орган[і]зацыі груп і брыгад праверкі.

Комсамольская ячэйка—ударная брыгада колгас[у]

Комсамол зьяўляецца ініцыятарам [і] застрэльшчыкам соцспаборніцтва. Кож[]ная комсамольская ячэйка, пры не[]пасрэдным кіраўніцтве і дапамо[зе] партыйнай ячэйкі, павінна стаць ін[і]цыятарам, організатарам соцспабо[р]ніцтва і ўдарніцтва ў сваім колгас[е]. Кожны комсамолец павінен быц[ь] ударнікам і працаваць па-ўдарнаму.

Ячэйка павінна разгарнуць работ[у] так, каб уцягнуць усю колгасну[ю] моладзь і дарослых колгасьнікаў [у] ўдарныя брыгады і ахапіць іх со[ц]спаборніцтвам. Уся работа комсамоль[]скай ячэйкі павінна быць пранізан[а] вытворчымі пытаньнямі колгасу і [ў] першую чаргу наладжваньнем соц[]спаборніцтва і ўдарніцтва.

Пачалася масавая сяўба. Колгась[]нікі з вялікім энтузіязмам выходзяц[ь] на поле змагацца за вытворчыя паказ[]чыкі другой бальшавіцкай вясны. Пераводзячы соцспаборніцтва і ўдар[]ніцтва ў вышэйшыя формы соцыяліс[]тычнай працы, уздымаючы творчы энтузіязм колгасьнікаў і ударны[я] бальшавіцкія тэмпы—выканаем задачы трэцяга, рашаючага году пяцігодкі, яшчэ шпарчей будзем крочыць да суцэльнай колектывізацыі, ліквідаваўшы на яе аснове кулацтва як клясу.

А. Усьмінскі.

На фронце тарпянага Донбасу прарыў

З 22 торпзаводаў толькі 9 распачалі працу. Большасьць заводаў не забясьпечаны абсталяваньнем і рабочай сілай. Мабілізаванай комсамольскай тысячы яшчэ няма на торпзаводах

Прыцягнуць да суровай партыйнай адказнасьці тых, хто ігнорує важнейшае рашэньне партыі і комсамолу

Першыя дні торпасэзону сьведчаць аб тым, што рад організацый злачынна ня выконвае рашэньняў ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ па пытаньнях работы тарпянай прамысловасьці і ператварэньня Беларусі ў тарпяны Донбас.

„Чырвоная Зьмена“ неаднокраць сыгналізавала аб недахопе тарпяных машын, але комсамольцы заводу Варашылава, якія вырабляе гэтыя машыны, нічога не зрабілі, каб форсаваць іх выпуск. На такую недаацэнку тарпянай прамысловасьці БССР, на поўнае занядбаньне гэтай працы не рэагавалі кіруючыя комсамольскія організацыі.

Торпзаводы адчуваюць патрэбу ў рабочай сіле. ЦК ЛКСМБ па прапанове „Чырвонай Зьмены“ пастанавіў мобілізаваць 1000 комсамольцаў на торпзаводы. Пастанова не праводзіцца ў жыцьцё.

ЦК ЛКСМБ абавязаў усе комсамольскія організацыі прыняць конкрэтныя мерапрыемствы для разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва на торпзаводах, для падрыхтоўкі і правядзеньня культмасавай работы. Аднак, і гэта дырэктыва ЦК ня выканана.

Мы лічым, што на чале комсамольскіх організацый павінны стаяць людзі, здольныя праводзіць у жыцьцё рашэньні партыйна-комсамольскіх організацый. Опортуністыя, якія недаацэньваюць значэньня торпздабычы ў БССР, павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Неабходна прыняць самыя рашучыя меры ў адносінах сэкратароў Гомельскага, Камарынскага, Мазырскага, Быхаўскага і інш. раёнаў, у адносінах усіх тых, хто ігнорує важнейшую пастанову ЦК ЛКСМБ, хто супраціўляецца ажыцьцяўленьню лёзунгу: „ператворым Беларусь у тарпяны Донбас!“

Трывожны сыгнал

Тарпяны сэзон пачаўся 5-га мая. Першыя дні сьведчаць аб наяўнасьці сур'ёзнага прарыву ў выкананьні пляну гэтага году.

З 22 прадпрыемстваў пачалі выдаваць толькі 9, але і яны поўнасьцю не нагружаны.

Згодна пляну меркавалася пусьціць 75 элеватарных машын з 152 целямі, а на сёньня пачалі працу установак з 47 арцелямі. З 12 агрэгатаў малога гідра-торпу з 36 целямі пачалі працу 2 агрэгаты і 4 арцелі. З 22 фрэзэраў ніводзін не працуе.

Пастанову ЦК комсамолу аб мобілізацыі 1000 комсамольцаў ніводзін РК ня выканаў. Першая партыя мобілізаваных павінна была зьявіцца на торпзаводы 25-га красавіка, але да гэтага часу зьявіўся толькі адзін чалавек.

Некаторыя заводы (Міхановічы, Грабянёва і інш.) маюць абсталяваньне і рабочую сілу, аднак, да гэтага часу не працуюць.

Вось яны—

раёны, якія злачынна ня выконваюць пастановы ЦК ЛКСМБ і дагэтуль не паслалі ніводнага комсамольца па торпзаводы

Торп-завод „Шлях Соцыялізму“ (Добруш).
Гомель—30 чалавек, Камарын—15, Хойнікі—20, Ельск—25, Мазыр—19.


Торп-завод „Чырвоны Кастрычнік“ (Барысаў).
Барысаў—12 чалавек, Крупкі—10. Талочын—10, Самахвалавічы—8.

Торп-завод „Чырвоная Беларусь“ (Магілёў).
Быхаў—20 чалавек, Журавічы—17, Азарычы—17.

Торп-завод „Колектыўная Праца“ (Клімавічы).
Клімавічы—20 чалавек, Амсьціслаў—10, Раслаўль—10 Краснаполье—5, Ляды—5.

Торп-завод „Першага Мая“ (Чашнікі).
Чашнікі—25 чалавек, Лепель—18, Сянно—16, Бешанковічы—10.

Мы чакаем адказу:—Чаму?



Комсамольцы ў ролі нагляднікаў

Завод імя Варашылава вырабляе торпмашыны. Комсамолія гэтага заводу, каб зьдзейсьніць лёзунг: „ператворым Беларусь ў тарпяны Донбас!“—павінна была-б узяць пад свой непасрэдны кантроль выкананьне пляну торпамашын.

Але здарылася наадварот. Пляны ня выконваюцца, а комсамол стаіць ў баку. Кіраўніцтва комсамольскай організацыі не патурбавалася паставіць пытаньне перад адпаведнымі організацыямі, каб яны своечасова забясьпечвалі завод сыравінай.

Ад комсамольцаў заводу Варашылава ў значнай меры залежыць ажыцьцяўленьне лёзунгу „Беларусь—тарпяны Донбас“! Мы настойліва патрабуем ад комсамоліі Варашылава сапраўды баявых, ударных спраў,

З.—Г.

Як можна зьнізіць сабекошт торпу

У барацьбе за зьніжэньне сабекошту торпу рашаючую ролю адыгрывае ступень падрыхтаванасьці рабочага тарпяніка.

На падставе досьледаў, праведзеных 1929-30 г. на Міхановіцкай тарпяной станцыі, выявілася, што можна палепшыць умовы эксплёатацыі пакладаў і зьнізіць вільготнасьць у рабочым сячэньні кар'еру, праводзячы асадкавыя канавы. Гэта—кароткія, глыбокія канавы, праведзеныя простастаўна да кар'еру, на адлегласьці 12-15 мтр. адна ад аднэй. Канавы гэтыя ўтвараюць вельмі энэргічную і ў той-жа час роўнамерную асадку берагу кар'еру і гэтым падрыхтоўваюць яго для наступнай выемкі. У выніку дзейнасьці асадкавых канаў за 6 месяцаў удалося атрымаць асадку балота, што даходзіла да 22 проц. яго першапачатковай глыбіні, сярэдняя-ж асадка на адлегласьці 1100 мтр. ворытнага вучастку—15,63 проц. Неабходна адзначыць, што пры звычайных умовах для асадкі патрабуецца рад год. Як вядома, адначасова з асадкаю, балота аддае ваду,—ушчыльняецца тарпяная покладзь. Аказваецца, што, ужываючы асадкавыя канавы, сярэднюю вільготнасьць покладу ўдаецца за 6 месяцаў зьнізіць на 1,8 проц. Гэтая лічба зьніжэньня вільготнасьці мае рашаючую ролю у памяншэньні сабекошту торпу. Тэорыя і практыка тарпянае справы даводзіць, што, пры зьніжэньні вільгаці; покладу на 1 проц., выхад сухога торпу з 1 клм. павялічваецца на 10 проц., сабекошт-жа пры гэтым зьніжаецца прыкладна на 3 проц.

У нашым выпадку зьніжэньне вільгаці на 1,8 проц. дае 22 проц. павялічэньня выхаду, 6,6 проц. зьніжэньня сабекошту, ці 54 кап. на 1 тону. Адначасова паляпшаюцца ўмовы ў кар'еры—поклад робіцца больш сухім, ліквідуюцца абвалы сьценак кар'еру і машынам лягчэй праходзіць.

З сказанага вынікае, што пры здабычы торпу, якая у сэзон 1931 году даходзіць па БССР да 884 тыс. тон, на адным толькі ўжываньні мэтоду асадкавых канаў можна атрымаць дзесяткі тыс. руб. экономіі. Над гэтым пытаньнем гаспадарнікам тарпянай прамысловасьці трэба задумацца.

Вішнеўскі

Сам Белторп ня ведае чаму

Асабліва дрэнна справа з забясьпечаньнем рабочых, у прыватнасьці спэцвопраткай. Так Башторг (Башкірыя) павінен быў забясьпечыць торпзаводы Беларусі 24.000 лапцей, але зараз наадрэз ад гэтага адмовіўся. Такім чынам тарпянікі засталіся без спэцвопраткі. Белкопсаюз ня выканаў дырэктывы, дадзенай ЦК КП(б)Б аб забясьпечаньні рабочых торпапрамысловасьці.

Такая работа з пачатку сэзону ня можа спрыяць ажыцьцяўленьню лёзунгу „ператворым Беларусь у тарпяны Донбас“.

Кантрольны пост ВСНХ і Белторпу Энцін і Гурэвіч.

Суцэльны.. правал

Барысаў, (Па тэлефону).

Падрыхтоўка да сэзону на торпзаводзе „Чырвоны Кастрычнік“ праходзіць надзвычай марудна. Рабсілы патрэбна 680 чалавек, а ў наяўнасьці толькі 215.

Райком комсамолу не правёў мобілізацыі на торпзавод па вызначанай ЦК разьвёрстцы, не організуе культмасавай работы на заводзе.

Кугель.

У месячнік друку зрабіць рашучы пералом у справе кіраўніцтва юнкор-рухам

(Ліст гаркомам і райкомам КП(б)Б, рэдакцыям цэнтральных, гарадзкіх і раённых газэт)

З 20-га мая па 20-га чэрвеня па БССР праводзіцца месячнік пролетарскага друку. Асноўныя палітычныя ўстаноўкі месячніка даны ў пастанове Сэкратарыяту ЦК КП(б)Б, якая надрукавана ў газэце „Зьвязда“ ад 6 мая.

Для практычнага ажыцьцяўленьня пастановы Сэкратарыяту ЦК КП(б)Б неабходна:

а) на адкрытых сходах парт. ячэек заслухаць 1) даклад аб пастановах ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове рабселькораўскага руху, аб сельскім, раённым і нізавым друку і аб месячніку друку. Асноўны ўпор у гэтых дакладах неабходна зрабіць на пытаньнях перабудовы рабселькораўскага руху і забесьпячэньня штодзённага конкрэтнага кіраўніцтва ім. 2) Даклад рэдколегіі насьценнай або шматтыражнай газэты (не даклад аб усёй рабоце, а па аднаму конкрэтнаму пытаньню); „Газэта і барацьба за сяўбу, за колектывізацыю і організацыю працы ў колгасах, а таксама работа з селькорамі“—для вясковых газэт і „Барацьба за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, аўладаньне тэхнікай, за адзінаначальле і гаспадарчы разрахунак, а таксама работа з рабкорамі“ (для фабрычна-заводзкіх газэт). Даклад рэдколегіі павінен быць шчыльна ўвязан з пытаньнямі конкрэтных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да надыходзячага ўсебеларускага зьезду рабселькораў і ў прыватнасьці з популярызацыяй і забясьпечаньнем практычнага выкананьня тых конкрэтных самаабавязацельстваў у галіне друку, якія ўзяты гэтай насьценгазэтай у сувязі з лістом менскіх ударнікаў друку (ліст, надрукаваны ў газэце „Зьвязда“ ад 6 мая). 3) Даклад упаўнаважанага па друку аб распаўсюджаньні друку на пэўным прадпрыемстве, у колгасе і г. д. і аб мерапрыемствах па павялічэньню распаўсюджаньня друку.

б) Правесьці праверку выкананьня ўсіх раней прынятых ГК, РК і ячэйкамі пастаноў па пытаньнях нізавога друку і рабселькораўскага руху, а таксама таго, як ажыцьцяўляюцца дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па друку. Праверку злучыць з опэрацыйнай работай па ажыцьцяўленьню тых пунктаў пастаноў, якія да гэтага часу ня выкананы.

в) У раёнах і гарадох організаваць агульна-раённыя і гарадзкія тэматычныя конкурсныя выстаўкі насьценных і шматтыражных газэт, а таксама тэматычныя кніжныя выстаўкі (літаратура па аўладаньню тэхнікай і г. д.) Лепшыя насьценныя газэты трэба прэміяваць і не пазьней з чэрвеня прыслаць у Менск для ўсебеларускай выстаўкі нізавога і раённага друку.

г) Дзень друку па БССР—20 мая—усе газэты адзначаюць спэцыяльнымі нумарамі газэт. На працягу месячніка пролетарскага друку—з 20 мая па 20 чэрвеня—неабходна сыстэматычна зьмяшчаць аддзелы, прысьвечаныя пытаньням месячніка, вылучыўшы для вядзеньня аддзелу спэцыяльнага работніка.

д) Агляды друку павінны зьявіцца сустаўной часткай кожнага нумару цэнтральнай, гарадзкой, раённай і шматтыражнай газэты. Гэтым аглядам Культпроп ЦК КП(б)Б надае важнейшае значэньне ў справе забясьпечаньня партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам. Агляды друку па свайму значэньню павінны прыраўноўвацца да перадавых рэдакцыйных артыкулаў.

ж) Сустаўной часткай месячніка друку павінна зьявіцца ўзмацненьне масавай работы вакол яшчэ большага распаўсюджваньня пролетарскай кніжкі як на беларускай мове, так і на мове нацменшасьцяй. Адначасова неабходна зрабіць праверку зьместу бібліотэк, зьняўшы ўсю шкодную нацыянал-дэмократычную літаратуру.

з) Распачаць вярбоўку лепшых рабселькораў-ударнікаў і непасрэдна партыйных работнікаў у надыходзячыя наборы на газэтныя аддзяленьні Комвузу імя Леніна, усебеларускай саўпартшколы, усебеларускага політасьветнага тэхнікуму,

і) Закончыць і падвесьці вынікі масавага агляду-самаправеркі работы нізавога друку, становішча рабселькораўскага руху і партківраўніцтва ім. Вынікі абавязкова павінны быць абгавораны на бюро ячэек, парткалектываў і РК КП(б)Б.

к) Для выбараў дэлегатаў на ўсебеларускі зьезд рабселькораў на больш буйных прадпрыемствах, у колгасах, саўгасах, МТС (конкрэтны сьпіс гэтых пунктаў будзе дадаткова апублікован оргкамісіяй па скліканьню зьезду)—непасрэдна скліканюцца ўнутрызаводзкія, колгасныя і г. д. зьлёты рабселькораў. Іншыя рабселькоры выбіраюць дэлегатаў на агульна-гарадзкіх, або раённых зьлётах.

Колькасьць выбіраных дэлегатаў і парадак выбараў (паведамім дадаткова) устанаўляецца оргкамісіяй. Зьлёты павінны быць праведзены ў часе паміж 20 мая (для гарадоў) і 30 мая (для сельскіх раёнаў).

Паводле атрыманых ЦК КП(б)Б вестак, у радзе асобных партыйных організацый не сконцэнтравана патрэбная ўвага да абвешчанай пастановай Сэкратарыяту ЦК КП(б)Б усебеларускай масавай політычнай кампаніі перавыбараў рэдколегій насьценных газэт.

Перавыбары рэдколегій павінны забясьпечыць ператварэньне брыгад друку ў вядучае зьвяно рабселькораўскага руху, узмацненьне ролі рабселькораўскага руху, як актыўнага праваднніка генэральнай лініі партыі. Ні ў якім разе нельга забываць аб рабоце з рабселькорамі-адзіночкамі, якіх неабходна ўцягваць ва ўдарныя брыгады друку.

У рэдколегіі насьценных газэт павінны выбірацца лепшыя ўдарнікі, адданыя змагары за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Культпроп ЦК КП(б)Б зварачае ўвагу цэнтральных газэт і фабрычна-заводзкіх друкаваных шматтыражак БССР на недапушчальнае незадавальняючае выкананьне цэнтральнымі газэтамі і шматтыражкамі пастановы ЦК КП(б)Б аб сыстэматычным і шырокім асьвятленьні на старонках газэт масавага агляду-самаправеркі нізавога друку, перавыбару рэдколегій і падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Загадчык Культпропам ЦК КП(б)Б **Чаркушэвіч.**

Загадчык сэктарам друку Культпропу ЦК КП(б)Б **Курцік.**

Друкарня імя Сталіна—прыклад кіраўніцтва юнкорамі

Друкарня імя Сталіна ў кожным цэху мае насьценгазэту. Добра асьвятляецца жыцьцё і праца кожнага цэху.

Шматтыражка выходзіць тры разы ў месяц. Старонка моладзі добра асьвятляе жыцьцё моладзі на прадпрыемстве і шляхі соцыялістычнага жыцьця, даюцца конкрэтныя прапановы для палепшаньня вытворчасьці. За апошні час у кожным цэху організаваны юнкораўскія брыгады.

Комсамольская ячэйка цікавіцца разьвіцьцём юнкорруху на прадпрыемстве. У час вытворчых манэўраў комсамольцы разам з юнкорамі займалі юнкор-пасты, дзякуючы гэтаму, манэўры былі добра асьвятлены як у насьценгазэтах, так і ў шматтыражцы.

Брыгада „Ч. З.“ Валет. Дадэка, Лапідус.

У Віцебску не зьвяртаюць увагі на юнкораў

Шмат юнкораў у Віцебску, але ні Гарком комсамолу, ні рэдакцыя газэты „Віцебскі пролетары“ намі ня кіруе.

Рэдакцыя абмежавалася толькі тым, што за ўвесь час дала нам два заданьні якія мы ўжо даўно выканалі.

Некалькі раз мы зьвярталіся да тав. Ланцыхоўскага (Культ-масавы аддзел рэдакцыі). Спачатку ён карміў нас „заўтракамі“. „Прыходзьце заўтра, абавязкова дам“, цяпер гаворыць: „Ня маю часу“.

Не дапамагло і тое, што зьвярнуліся да адказнага сэкратара рэдакцыі. Так і блытаюцца юнкоры Віцебшчыны. Ніхто не падумае аб тым, што імі трэба кіраваць і дапамагаць у працы.

З. Ваўчок.

ЗЬЛЁТ УДАРНІКАЎ ПЯРА 3-га ПАКАЛЕНЬНЯ

Кожны крок сваёй работы штодзённа зьвязваць з задачамі партыі і комсамолу

Павысіць якасьць комсамольскага кіраўніцтва дзяткоррухам

Вялікую ролю ў організацыі дзяцей працоўных навакол задач партыі і ўлады, у організацыі іх на пасобных конкрэтных вучастках работы, адыгрывае дзіцячы комуністычны друк. — Быць ня толькі пропагандыстым, але і колектыўным організатарам рабочае клясы, працоўных на вырашэньне і выкананьне задач партыі і ўлады—гэта задача комуністычнага савецкага друку. Гэтыя-ж задачы стаяць і перад дзіцячым комуністычным друкам. Так, а ня інача. Толькі прапагандысты і організатар.

Як газэты „Піон. Бел.“ і „Юнг. Ленінец“ спраўляюцца з гэтымі задачамі? Які крок зроблен газэтамі ў практычнай рабоце?

Адказам на гэтыя пытаньні зьяўляюцца факты конкрэтнай работы. У піонэрскай організацыі Беларусі быў політычны прарыў. Да агляду не з боку ЦБ ДКО ЦК ЛКСМБ у організацыі не адчуваўся патрэбны ў сучасны момант зрух па ўдзелу дзяцей у соцыялістычным будаўніцтве.

Газэта „Піонэр Беларусі“, як адзначана ў вывадах, адыграла вялікую ролю ня толькі ў ліквідацыі політычнага прарыву ў піонэр-організацыі, але своечасова сыгналізавала аб політычных прарывах у пасобных райорганізацыях, дабівалася выпраўленьня памылак і палепшаньня работы. Трэба адзначыць і тыя поспехі, якія мае газэта ў галіне організацыі дзяцей працоўных, пад кіраўніцтвам партыі і комсамолу, у прамысловасьці і сельскай гаспадарцы.

Своечасова ўзьняўшы пытаньне аб ліквідацыі прарыву на вытворчасьці і ўдзеле дзяцей, газэта, пры актыўным падтрыманьні і дапамозе дзяткораў, ячэек КСМ, дабілася:

актыўнага ўдзелу піонэраў і школьнікаў Гомеля, Менску, Віцебску і Барысава ў рабоце на вытворчасьці. Гэта відаць з таго, што газэта організавала дзяцей на праведзеньне вытворчых манэўраў (Гомель—„Палесдрук“, завод „Пролетары“, завод імя Ланцуцкага; Барысаў—завод „Пролетары“, ф-ка „Пролетарская перамога“ і г. д.) Пры актыўнай дапамозе дзяцей тут створаны новыя ўдарныя брыгады, праведзены суботнікі, выяўлены прагульшчыкі, праведзены вытворчыя карнавалы.

На адозву ЦК і СНК аб ліквідацыі прарыву на транспорце, газэта своечасова высунула пытаньне аб праведзеньні піонэрскай транспортнай эстафэты—за адраджэньне цягніў. Але ў гэтай галіне газэта дапусьціла памылку ў тым, што яна несвоечасова рэагавала на бязьдзейнасьць раду раёнаў у правядзеньні эстафэты.

Піонэр-організацыя Беларусі склала дагавор з Наркомземам і Белкалгасцэнтрам на актыўны ўдзел у колектывізацыі сельскай гаспадаркі. Вялікую ролю ў організацыі атрадаў і школ на выкананьне дагавору адыгрывае газэта „Піонэр Беларусі“ і „Юнгер Ленінец“.

Сыстэматычна, яшчэ з пачатку сьнежня 1930 г., газ. „Піонэр Беларусі“ пачынае падрыхтоўку і організацыю атрадаў і школ па сустрэчы 2-й бальшавіцкай вясны. Своечасова складаецца дагавор на соц. спаборніцтва з колгасамі, організацыяй працы (Зялёнагайская школа), уцягненьне бацькоў і аднаасобнікаў суседзяў у колгас (Хоцімскі раён), закупка 2-х трактараў на сродкі сабраныя ад піонэр-організацыі—вось некаторыя вынікі барацьбы газэты за колгаснае будаўніцтва, за ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Сотні тысяч пудоў ачышчанага насеньня, сабранага попелу, паход атрадаў і школ у дапамогу прыгарадным гаспадаркам (Менск), сьвінагадоўля, складаньне дагавораў па соц. спаборніцтву з колгасамі, організацыі працы, барацьба з шовінізмамі, вельмі колерам, нац-дэмократызмам, вельмі многа залежала ад таго, як газэта стварала дзяткораўскі актыў, як шырока прыцягвала гэты актыў да працы.

Тут вялікія дасягненьні. Год таму назад былі толькі адзінкі дзяткораў. Зараз „Піонэр Беларусі“ налічвае дзяткораўскі актыў у 984 чалавекі і 60 ашчатных дзяткораўскіх брыгад у раёнах і сельсаветах.

Ня гледзячы на рост дзяткораўскай арміі, усё-ж у кіраўніцтве імі маюцца недахопы з боку рэдакцыі, а асабліва з боку РБ ДКО і Райкомаў КСМ. Рад узьнятых самімі дзяткорамі пытаньняў не даводзіцца да канца, ня ўсюды і не заўсёды хутка рэагуецца на іх допісы.

РБ ДКО яшчэ не дае належнага кіраўніцтва дзяткорам на мясцох, не організоўвае дзяткораў і не выкарыстоўвае іх як перадавікоў, організатараў—ударнікаў дзяцей працоўных.

Гэтая работа надзвычайна важная. Вось чаму зараз, калі зьбіраецца першы Усебеларускі зьлёт дзяткораў, трэба з усёй вастрынёй паставіць пытаньне перад ячэйкамі КСМ і РБ ДКО аб замацаваньні кіраўніцтва дзяткор-брыгадамі, пастамі і дазорамі, ДКО аб ажыцьцяўленьні кожнай праверкай дзяткораў, аб пэратварэньні кожнага радка газэты ў жывыя конкрэтныя справы.

Палепшаньне кіраўніцтва дзяткорамі і насьценнымі газэтамі павінна значна палепшыць становішча бальшавіцкай самакрытыкі ў атрадах і школах. Факт, выкрыты газэтай „Піонэр Беларусі“ ў Хоцімскай ШКМ, дзе дзяткор-актывіст выключаны са школы за тое што ён выкрываў недахопы, за тое, што ён выкрыў кулацкую групоўку вучняў, якія зрывалі мерапрыемствы партыі і ўлады,—гэты факт гаворыць аб тым, што комсамольская ячэйка і ра ком дапусьцілі політычную памылку, опортуністычна падыйшлі да пытаньня, замест разгортваньня самакрытыкі ў школе, яны фактычна дапамагалі выключэньню дзяткора Майсеенкі, цкаваньню яго.

Гэт факт гаворыць аб тым, што трэба найхутчэй павярнуць комсамольскую ячэйку, РБ ДКО тварам да дзяткор-руху, і палепшыць становішча насьценгазэт у атрадах і школах.

Гэтыя задачы павінны быць найхутчэй ажыцьцёўлены. Гэтага ў праве патрабаваць ад нас дзяткоры ў асобе свайго першага Ўсебеларускага зьлёту.

Шпіцэр,

Мы павінны выканаць абавязкі шэф[а]

Надаючы асабліва вялікае значэньне справе культурнай рэволюцыі і ў першую чаргу справе ўсеабучу і нагалоўнай ліквідацыі няпісьменнасьці сярод працоўных СССР, ЦК УсеКП(б) прапанаваў комсамолу мобілізаваць 50 тысяч лепшых комсамольцаў-ударнікаў вытворчасьці і палёў на пэдагогічную працу ў школах.

Выконваючы гэты ганаровы абавязак, практычна выконваючы абавязкі шэфа—ўсеабучу, Цэнтральны Камітэт Комсамолу Беларусі пастанавіў мобілізаваць 500 комсамольцаў на шасьцімесячныя пэдагогічныя курсы.

Улічваючы горкі вопыт мінулага году, калі з-за казённых, а калі-ні-калі і проста опортуністычных адносін паасобных райкамолаў была правалена мобілізацыя 1500 комсамольцаў у пэдустановы і амаль напалову сарвана мобілізацыя 500,—ЦК катэгорычна абавязаў РК своечасова і поўнасьцю выканаць мобілізацыю 500, усклаўшы адказнасьць за мобілізацыю пэрсанальна на сэкратароў РК і ГК, зрабіўшы іх упаўнаважанымі па выкананьню разьмеркаваньня ЦК аб мобілізацыі 500.

Ня гледзячы на асаблівую важнасьць гэтае справы, ня гледзячы на ўсю катэгорычнасьць, з якою ЦК прапанаваў выканаць дадзенае разьмеркаваньне, яшчэ і да гэтага часу (на 30-ІУ-31 г.) мобілізацыя выканана ўсяго толькі на 43,4 проц., што дае 217 чалавек. Гэта колькасьць падае на 52 раёны, а астатнія 43 (Менскі, Гомельскі, Віцебскі, Бабруйскі і г. д.) ня толькі ня выканалі дадзенага разьмеркаваньня, але надзвычайна безадказна аднесьліся да гэтае справы. На пастанову, дзьве адносіны і дзьве тэлеграмы Цэнтральнага Камітэту яны адказалі... маўчаньнем.

Найбольш безадказным у гэтых адносінах зьяўляецца Менскі Гарком комсамолу.

Згодна разьмеркаваньня ЦК, Менскі ГК павінен быў мобілізаваць у лік 500—20 комсамольцаў. Аднак, ГК гэтай справай не займаўся і ніводнага комсамольца на пэдкурсы не паслаў. Ня лепш справа і ў Віцебскім, Гомельскім, Бабруйскім, Магілеўс[кім] і Аршанскім райкамолах, якія т[...] сама разьмеркаваньня не выкан[алі] і аб стане мобілізацыі не паведа[мі]лі ЦК. Гэта з асаблівай яскрава[сь]цю сьведчыць аб тым, што пера[...]чаныя райкомы, у прыватнас[ьці] упаўнаважаныя (сэкратары РК), [не] разумеюць той вялізарнай адказна[сьці], якую ўзялі на сябе комсам[ол], прыняўшы абавязкі шэфа, не ра[зу]меюць практычных задач комсам[олу] ў правядзеньні ўсеабучу.

Сярод выканаўшых разьмерк[а]ваньне ёсьць рад райкомаў, як[ія] формальна адносіліся да мобіліза[цыі] комсамольцаў. Амаль усе яны мо[бі]лізавалі толькі вучняў 7-й груп[ы] і не забясьпечылі соцыяльнага скл[а]ду мобілізаваных (Круглянскі [...] мобілізаваў серадняка, які плаці[ў] 40 руб. сельска-гаспадарчага пада[т]ку).

Найбольш бюрократычна да м[о]білізацыі аднёсься Быхаўскі РК, я[кі] сьпісаў комсамольцаў, што са[мі] паступілі на курсы і паведаміў Ц[К], што яны мобілізаваны райкамола[м]. Такіх „мобілізаваных“ упаўнаваж[а]ны Захараў (сэкратар Быхаўска[га] РК) налічыў аж 25 чалавек, та[ды] як РК ніводнага комсамольца [не] пасылаў.

Такім чынам, дзякуючы казённ[ым] адносінам, а ў іншых выпадках простай права-опортуністычнай н[е]дааўэнцы важнасьці справы культ[ур]най рэволюцыі радам апаратчык[аў] і ўпаўнаважаных,—комсамол Бел[а]русі ня справіўся з ганаровай за[да]чай ня даў 500 лепшых прадста[ў]нікоў на культурны фронт, [не] выканаў пастановы ЦК КП(б)Б [аб] мобілізацыі 500 комсамольцаў [на] пэдкурсы.

Такое становішча далей працяг[ва]вацца ня можа.

Комсамольская організацыя Бел[а]русі павінна выканаць свае абавя[з]кі шэфа, што яна бязумоўна зр[о]біць.

Вясеньні набор у пэдустанов[ы] павінен быць праведзены ў значна[й] меры за лік комсамольцаў.

Упаўнаважаны ЦК ЛКСМБ па мобілізацыі 500—Рубеньчык

Дзяткоры-ўдарнікі ўпісалі баявыя старонкі ў кнігу соцбудаўніцтва

30 дзяткораў-ударнікаў газэты „Юнгер Ленінец“ сустрэнуцца 15-га мая на ўсебеларускім зьлёце дзяткораў. Гэта лепшыя прадстаўнікі ад 800 дзяткораў, раскіданых па гарадох і мястэчках Савецкай Беларусі.

Дэлегаты—дзяткоры раскажуць з трыбуны, як дзяткораўскія брыгады, пад кіраўніцтвам комсамольскіх ячэек і рэдакцыі „Юнгер Ленінец“ змагаліся за 5-годку ў 4 гады, яны раскажуць аб ліквідаваных прарывах на фабрыках і заводах, яны раскажуць аб барацьбе за новыя колгасы супроць кулацтва.

Рэдакцыя „Юнгер Ленінец“ таксама мае што расказаць. перад зьлётам яна будзе рапартаваць аб добрых і дрэнных баках свае працы. Яна раскажа зьлёту як дабілася дасягненьняў.

Сёньня варта ўспомніць некаторых дзяткораў-ударнікаў.

Дзяткор—Крошынскі з Менскай 7-й школы ўнёс прапанову організаваць усебеларускі марш за колгасы. Гэтае пытаньне было абгаворана на наседжаньні ЦБ ЮП, і разам з братэрскім органам—„Піонэрам Беларусі“ мы правялі гэты марш. Дзесяткі новых колгасаў даў гэты марш. Марш паказаў, як мільёнамі дзіцячых рук дапамагае 3-е пакаленьне новаму прыліву ў колгасы.

Хто з вас помніць інтэрнацыянальную дзіцячую брыгаду, якая была паслана ў інтэрнацыянальныя колгасы па ініцыятыве „Юнгер Ленінец“? Разам з рэдакцыяй „Піонэр Беларусі“ мы паслалі ў колгасы 50 лепшых брыгадзіраў з „Юнгер Ленінец“ і „Піонэр Беларусі“,

Дзяткораўскія брыгады „Юнгер Ленінец“ прымалі вельмі актыўны ўдзел у завочнай політэхнічнай конфэрэнцыі, якая працягвалася больш 3-х месяцаў на старонках газэты.

Варта спыніцца на працы дзяткораўскай брыгады Гомеля. Гомельскія эспэрантыстыя, якія ўвесь час працавалі па спэцыяльным заданьням рэдакцыі „Ю. Л.“, зьвязалі нас з дзіцячым комуністычным рухам у розных капіталістычных краінах. У дзень зьлёту мы павінны адзначыць заслугі **Ціцэнскага і Пераплётчыка** (Гомель).

Дзяткораўская брыгада менскіх атрадаў і школ наладзіла рад налётаў і рэйдаў: а) у пачатку навучальнага году на Наркомасьветы, МЦРК і Цэнтрвыдат; б) аб становішчы антырэлігійнай працы ў школах; в) аб становішчы інтэрнацыянальнага выхаваньня; г) рэйд да пролетарскіх пісьменьнікаў; д) рэйд у Цэнтрвыдат аб становішчы з падручнікамі к навучальнаму 1931-32 г.

Дзяткораўскія брыгады на мясцох правялі рэйды барацьбы з другагодніцтвам, па ўдзелу ў другой бальшавіцкай сяўбе, марш за тэхніку, супроць сымулянтаў, прагульшчыкаў, лятуноў, за новых ударнікаў імя „518 і 1040“.

Вось, коратка, з чым армія дзяткораў і рэдакцыя прыходзіць да зьлёту. Усё пералічыць немагчыма. Трэба сказаць, што ня ўсё яшчэ добра. Не заўсёды мы кіравалі, як гэта павінна быць, дзяткораўскімі брыгадамі і дзяткорамі. Мы пачалі друкаваць на старонках „Ю. Л.“ завочныя курсы для дзяткораў, але мы гэтыя курсы спынілі. У далейшай працы, з дапамогай самых дзяткораў, мы выправім гэтыя памылкі.

20-га мая будзе ў Менску складзена ўмова 3-х: Беларусія, Азэрбэйджан, Заходняя вобласьць. Дагавор будзе ў далейшым—компасам нашай працы, нашай баявой програмай, асноўным плянам для кожнай дзяткор-брыгады, для кожнага дзяткора і рэдколегіі.

У дзень зьлёту прыедзе прадстаўнік газэты „Зай Грэйт“ (піонэрская газэта на Украіне) для складаньня ўмовы з рэдакцыяй газэты „Юнгер Ленінец“, на базе дагавору 3-х.

Задачы, ускладзеныя Ленінскай партыяй на 3-е пакаленьне, будуць выкананы.

Дзяткор-ударнік—організатар дзяткораўскай масы ў барацьбе за соцыялізм.

Н. Вайнгаўз.

Пастанова

сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ аб выніках мобілізацыі 500 комсамольцаў на шасьцімесячныя пэдагогічныя курсы

1. Наяўнасьць 217 чалавек, мобілізаваных у лік 500 на шасьцімесячныя пэдкурсы, што складае 43,4 проц., сьведчыць аб тым, што мобілізацыя 500 праведзена нездавальняюча.

Адзначаючы, што мобілізацыю праводзілі толькі 52 раёны, а астатнія 46 мобілізацыю ня выканалі і не паведамілі ЦК аб становішчы яе (мобілізацыі), ЦК ЛКСМБ расьцэньвае такое становішча як наяўнасьць права-опортуністычнай недааўэнкі справы ўсеабучу, як безадказныя адносіны да выкананьня дырэктыў Цэнтральнага Камітэту.

У сувязі з тым, што пэдкурсы працуюць месяц і патрэбная колькасьць слухачоў набрана, лічыц[ь] мобілізацыю скончанай.

2. За невыкананьне дырэктывы ЦК аб мобілізацыі комсамольцаў [у] лік 500—вынесьці вымову загад[чы]кам аддзелаў адукацыі і быт[у] Менскага Гаркому—тав. Фрумкінай, Віцебскага Гк-т. Гальштэйн, Гомел[ь]скага Гк—т. Цярэнцьеву, Бабруй[]скага Гк—тав. Клопавай, загадчыкам аддзелаў адукацыі і быту Магілеўскага, Аршанскага, Крычаўскага і Шклоўскага РК ЛКСМБ.

3. Лічыць неабходным недамобілізаваных 283 чалавек мобілізавац[ь] у навучальныя пэд'установы у вясеньні набор 1931 году.

Прапанаваць аддзелу адукацыі і быту ЦК распрацаваць мерапрыемствы па мобілізацыі комсамольцаў у навучальныя пэд'установы ў вясеньні набор 1931 году.

4. Гэтую пастанову надрукаваць у „Чырвонай Зьмене“.

Безадказны адказ

У адказ на артыкул, зьмешчаны ў нумары 100 вашай газэты ад 4 мая „Даць гаручае і змазку трактарам“, павядамляем:

У сувязі з позьняй вясной у БССР, Саюзнафта скараціла на 40 проц. наш плян завозу гаручага на красавік м-ц.

Аднак, і скарочаны плян выкананы толькі на 30 проц. З самага пачатку красавіка Белкаапсаюз прымаў усе неабходныя меры, як праз Цэнтрасаюз, Наркамзем, так і інш. організацыі, каб своечасова і поўнасьцю забясьпечыць гаручым. У выніку—Масква ў сярэдзіне красавіка вылучыла нам усяго 12 цыстэрн з тэрміновай адгрузкай (з патрэбных 143), а к канцу месяца дала распараджэньне Адэсе адправіць два маршруты з гаручым.

Забясьпечаньне трактароў Белкоопсаюз узяў пад асобы нагляд і пры ўсякіх затрымках і перабоях безадкладна прымае меры. Апрача фарсаваньня завозу, прымаюцца меры дзе гэта мажліва, да перакідкі газы з больш забясьпечаных пунктаў у іншыя раёны.

Мы лічым, што ўсе мажлівыя і неабходныя меры прыняты, аднак становішча з забясьпечаньнем трактароў усё-ж застаецца напружаным.

Белкоопсаюз

Ад рэдакцыі:

Прайшло шэсьць дзён пасьля зьмяшчэньня ў нашай газэце заметкі і Белкоопсаюз „сьпешна“ паведамляе аб прынятых мерах.

Жахліва сьпешныя меры Белкопсаюзу прывялі к таму, што гаручым МТС забясьпечаны на 12, у проц. сярэднім, многія МТС зусім ня маюць гаручагага.

Белкоопсаюз піша ў адказе: „Становішча з забясьпечаньнем трактароў у БКС знаходзіцца пад асобным наглядам пры ўсіх затрымках і перабоях безадкладнам прымаюцца меры“.

Гэта толькі на словах. З гаручым катастрафічнае становішча.

ЦКК-РСІ павінна зьвярнуць увагу на такія адносіны з боку БКС. Гэта не адказ Белкоопсаюзу на сыгналы газэты, а прыклад безадказнасьці.

Паведамленьне

Сёньня 14-га мая, а 6-й гадзіне ўвечары ў МенгаркомеЛКСМБ адбудзецца нарада сэкратароў колектываў ячэек ЛКСМБ Менскай організацыі.

Яўка абавязкова.

Сэкратар Менгаркому Янковіч.

Друкарня імя тав. Сталіна. Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ. Галоўлітбел № 599